**Карабань, Н.** Расказаў настаўнік пра сябе / Н. Карабань // Пастаўскі край. — 2009. — 14 лют. — С. 2.

## РАСКАЗАЎ НАСТАЎНІК ПРА СЯБЕ

Рыхтуючы мерапрыемства, прысвечанае Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, вырашыла не абмяжоўвацца толькі лічбамі і фактамі сумнай статыстыкі. Шматгадовы вопыт педагагічнай работы падказваў: найбольшы выхаваўчы эфект атрымаецца тады, калі ўспамінамі падзеліцца сведка і ўдзельнік ваенных падзей на тэрыторыі іншых дзяржаў. Ведаючы аб тым, што настаўнік гісторыі Іосіф Іванавіч Пяткоўскі – былы «афганец», яго і запрасіла выступаць перад дзецьмі. А паколькі абое з'яўляемся класнымі кіраўнікамі старшых класаў, вырашылі правесці сумеснае мерапрыемства.

І вось у вызначаны час усе сабраліся ў кабінеце гісторыі. Пачынаю весці гаворку. Увагу завастраю на тым, што 15 лютага – не проста Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, сёлета спаўняецца 20 гадоў, як савецкія войскі былі выведзены з Афганістана. У ліку тых, хто прайшоў праз афганскае пекла, і Іосіф Іванавіч. Яму і прадастаўляю слова. Расказаў настаўнік вучням, што давялося перажыць. Служыў спачатку ў Ашхабадзе, затым у афганскім Гардэзе. У баявых дзеяннях не ўдзельнічаў, бо быў сувязістам. Але пра вайну расказаў не кніжнымі фразамі. Ведае, як гінулі савецкія хлопцы і колькі іх навечна засталося маладымі. Дарэчы, з афганскай вайны не вярнуліся дамоў і трое нашых землякоў.

Часць, у якой служыў І. І. Пяткоўскі, адной з першых пакідала Афганістан, бо дыслацыравалася на самай аддаленай савецкай мяжы тэрыторыі. Было гэта ў маі 1988 года. І па сённяшні дзень Іосіф Іванавіч памятае, як салдаты цалавалі родную зямлю, а людзі сустракалі іх з кветкамі. Заканчваў тэрміновую службу ў Туркменіі.

У памяць аб той вайне, загінуўшых воінах настаўнік пад гітару праспяваў песню. Дзеці слухалі, як зачараваныя.

**Н. Карабань**, настаўніца Лучайскай базавай школы